Аляксандрава Т.

# НАСТУПАЛА ГРОЗНАЯ БРАНЯ

Герой Савецкага Саюза (24.03.1945) Уладзімір Раманавіч Яўсеенка нарадзіўся 22.11.1922 г. у в. Рынкоўка Чэрыкаўскага раёна. З сялян. Беларус. У Чырвонай Арміі з 1941 г. Удзельнік вызвалення Украіны, Малдавіі, Венгрыі. Механік-вадзіцель танка гвардыі ст. сержант У. Р. Яўсеенка вылучыўся ў жніўні 1944 г. пры вызваленні Румыніі і фарсіраванні р. Сірэт. Экіпаж танка ў баях за гарады Бырлад, Фокшані, Бузэу знішчыў 5 самаходных установак, 5 гармат і больш 400 гітлераўцаў, захапіў 8 мінамётаў, 400 вінтовак і 10 ручных кулямётаў, першым прарваўся да моста цераз р. Сірэт, знішчыў 3 артбатарэі і трымаў мост да падыходу падмацавання.

Пасля вайны да 1961 г. працаваў у Томску намеснікам начальніка трэста "Сібэлектрамантаж".

У аблічччы гэтага чалавека не варта вышукваць штосьці незвычайнае. Твар, якіх сотні і тысячы ўбачыш у натоўпе і не звернеш увагі – самы звычайны твар. Нос "бульбінкай". Постаць таксама непрыкметная. Але пры больш блізкім знаёмстве з Уладзімірам Раманавічам Яўсеенкам вас уразіць прамы позірк уважлівых вачэй, сціпласць чалавека, які, прыняўшы на свае плечы нялёгкую славу Героя, не страціў і па сённяшні дзень гэтай сціпласці. Мне прыгадаўся момант, калі Уладзімір Раманавіч разам з таварышамі, якія наведалі Чэрыкаўшчыну ў святочныя дні вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў, прыйшоў да нас развітацца. Як ён быў уражаны, усхваляваны, калі яму ўручылі сціплы падарунак – кніжкі беларускіх пісьменнікаў аб мінулай вайне.

– Я даўно не жыву ў Беларусі, – сказаў ён тады, – але пастаянна адчуваю, што я сын зямлі беларускай.

Вось і зараз перад яго вачыма паўстаюць тыя прыгожыя мясціны: хата за ракой, пакрытая саломай, каля ганка – стары клён. Іх, дзяцей, абавязкам было ў дзень, калі пяклі хлеб, нарваць з клёну разлапістых лістоў, на якія потым увішныя рукі маці клалі белыя кругляшы цеста. Пах свежай падсмажанай хлебнай скарынкі Уладзімір Раманавіч запомніў назаўсёды. Але Яўсеенкі тады хлеб пяклі не часта, не гаворачы ўжо пра булкі. У сям'і толькі дзяцей шасцёра, і хоць быў кавалак зямлі, карова, конь, не хапала сродкаў, каб усе былі і сыты, і апрануты. І бацька вырашыў: едзем у Сібір абжываць тамашнюю зямлю. Сям'я жыла светлымі марамі, бо дзеці адзін за адным падрасталі, былі падрыхтаваны да самастойнага жыцця. Але мірныя планы перарвала вайна. У гэта не хацелася верыць, пакуль вайна не пастукала ў дзверы. Уладзімір Яўсеенка трапіў у авіятэхнічнае вучылішча, а пасля яго

заканчэння – у танкавы полк, дзе патрэбна было ў дасканаласці вывучыць бронемашыны, танкі. У 1943 г. прыйшоў час "панюхаць" пораху на фронце. Гэта быў 2-гі Украінскі фронт, 6-я гвардзейская Чырванасцяжная танкавая армія. Насіць імя гвардзейца і ганарова і нялёгка. Гэтага звання Уладзімір быў удастоены за ўдзел у Корсунь-Шаўчэнкаўскай аперацыі, за яе атрымаў і першую сваю ўзнагароду — медаль "За адвагу". Вельмі сімвалічна, што паслужны спісак будучага героя пачынаўся менавіта вось так – з адзнакі яго мужнасці і адвагі. А пазней танкісты пераканаліся, што адвага – рыса характару Яўсеенкі такая ж, як і сціпласць, і сумленнасць, – рыса, характарызуючая сапраўднага чалавека.

Першая ўзнагарода, асабліва памятная, як і падзеі, звязаныя з ёй. Фашысты ў шалёнай лютасці спрабавалі разарваць кальцо, якое нашы часці замкнулі вакол Корсунь-Шаўчэнкаўскай групіроўкі. Атакі ішлі адна за другой. На адну з дарог вораг кінуў да 90 танкаў. Нягледзячы на пераўзыходзячыя сілы, рух праціўніка быў спынен. Танкам Яўсеенкі былі знішчаны два танкі і адна самаходная ўстаноўка праціўніка. Фашысты распачалі новы манеўр – варожая пяхота абышла трыццацьчацвёркі і зайшла ў тыл.

Нянавісць да чужынцаў, да агрэсараў і захопнікаў ахапіла кожнага савецкага воіна. І танк Яўсеенкі раз-пораз выяўляў гэтую нянавісць згусткамі рыжага агню, трапнымі чэргамі. Кулямёт біў бесперапынна. Тут выручаў Уладзімір. Калі танк вёў бой з месца, ён, як механік-вадзіцель, па сутнасці, бяздзейнічаў і ў гэты час зараджаў дыскі кулямёта.

У жніўні 1944 г. танкавая брыгада, у якой служыў Яўсеенка, перайшла ў наступленне пад Ясамі. Гэта была ўжо румынская зямля. Горад Бырлад. Вораг наладжваў засады, мініраваў дарогі, але нішто не магло спыніць баявы парыў нашых войск. Фашысты не спадзяваліся, што савецкія танкі пройдуць прасёлачнымі дарогамі праз горы, і не чакалі ўдару ў гэтым напрамку. А танкі з маршу ўступілі ў бой за горад. Уладзімір бачыць, як услед за стрэлам пераварочваецца нямецкая гармата, а другая папала пад гусеніцы танка. Да ночы палавіна горада ўжо ў руках вызваліцеляў. Раніцай танк Яўсеенкі атакаваў чыгуначную станцыю, падбіў адзін з цягнікоў. Фашысты ў паніцы ўцяклі. Так было захоплена тры эшалоны са зброяй і боепрыпасамі.

Горад Бузэу. Начная атака не ўдалася, і камандаванне прымае рашэнне – выдзеліць тры танкі і паслаць іх у засаду ў тыл ворага, каб перахапіць шашу і чыгунку. У ліку гэтых траіх і танк Яўсеенкі. На світанні, як і задумана, тройка, удала прайшоўшы варожы тыл, нечакана ўрываецца на чыгуначную станцыю, дзе, гатовыя да адпраўкі, стаяць эшалоны з танкамі, аўтамашынамі, усюдыходамі. Першыя ж стрэлы прымусілі фашыстаў уцякаць. Станцыя захоплена, але танкі імчаць далей. Вось паказаўся аэрадром. Каб не выявіць сябе, танкісты па пасевах кукурузы абыходзяць яго і выходзяць на тылавыя дарогі горада.

Гэты рэйд залічыў на рахунак экіпажа тры самаходныя гарматы і адзін танк, знішчаную жывую сілу праціўніка. Нельга не ўспомніць і бой за горад Факшані. Знішчана самаходка, бронетранспарцёр, к вечару горад наш, гарыць аэрадром. Але, здаецца, што і Машыне перадалося захапляючае пачуццё не спыняцца, ісці ўперад, граміць ворага. І танк Яўсеенкі вырваўся за горад і першым падышоў да моста цераз раку Сірэт. Трапным агнём была знішчана ахова. Не марудзячы, танкісты перайшлі на супрацьлеглы бок ракі і забяспечылі ахову моста да таго часу, пакуль не падышлі асноўныя сілы. За гэту аперацыю ўсе члены экіпажа танка былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

**Аляксандрава, Т. Наступала грозная браня / Т. Аляксандрава // Памяць : Чэрыкаўскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдакцыйная калегія: В. М. Ермакоў [і інш.]. — Мінск, 1994. — С. 470—472.**